# ПРАЎДА Мастоўская

№ 1-2 (72-73) снежань - люты 2009 года



**Калі вы жадаеце атрымліваць**
у далейшым наша выданне, калі ласка, дашліце sms з паведамленнем адраса, на які павінна прыходзіць **«Мастоўская праўда»** на нумар :
**+ 48 725 302378**


# Мастоўскі райвыканкам баіцца пратэстаў

**Сябру Рады Руху "За Свабоду" Алесю Зарэмбюку паўторна адмовілі ў арганізацыі і правядзенні пікетавання супраць падвышэння тарыфаў ЖКГ. У акцыі пратэсту планаваў узяць удзел лідэр Руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч.**

Першапачаткова заяўнікі планавалі правесці пікетаванне супраць росту тарыфаў на паслугі ЖКГ 3 лютага, але ж тады мастоўскі райвыканкам адмовіў у правядзенні мерапрыемства па фармальных прычынах. 28 студзеня ў Мастоўскі райвыканкам была накіравана паўторная заўка, з улікам прэтэнзій Мастоўскага райвыканкамана, на правядзенне акцыі пратэста 12 лютага. Мастоўскі райвыканкам паўторна не дазволіў праводзіць масавае мерапрыемства, на гэты раз ў сувязі з тым, што дадзенае мерапрыемства не можа адбывацца ў заяўленным месцы. Мастоўскія улады не палічылі патрэбным аргументавана патлумачыць сваю адмову у правядзенні пікетаванне супраць росту тарыфаў ЖКГ і не адказалі чаму акцыя пратэсту не можа адбывацца на пл. Леніна каля будынку Белтелекама?



**Ул.інф.**

# Пронскага запугвалі і спрабавалі завербаваць

**14 студзеня прарэктар Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўнівэрсітэта Аляксандр Дудук выклікаў каардынатара кампаніі "За Еўрапейскую Мастоўшчыну" Алега Пронскага на прафілактычную гутарку. На наступны дзень юнака спрабавалі завербаваць супрацоўнікі КДБ Беларусі.**

14 студзеня сустрэча адбывалася ў кабінеце першага прарэктара аграрнага ўніверсітэта, якога хвалявала празмерная грамадзянская актыўнасць студэнта. Аляксандр Дудук паказаў студэнту 5-га курса агранамічнага факультэта і вышэйшай школы кіравання Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта Алегу Пронскаму здымкі з штогадовага фэсту ўшанавання памяці братоў Каліноўскіх у Свіслачы, у правядзенні якіх малады чалавек браў актыўны ўдзел а таксама нагадаў пра іншыя факт. Прарэктар



Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта параіў Пронскаму не ламаць свой лёс і спыніць грамадска-палітычную дзейнасць, інакш гаспадарка, ў якую размеркаваны студэнт, можа адмовіцца ад такога спецыяліста. Па словах прарэктара, калі малады чалавек не спыніць сваю грамадскую актыўнасць, адміністрацыя універсітэт вымушаны будзе пераразмеркаваць Пронскага ў Гомельскую вобласць.На наступны дзень, студэнта Пронскага раніцай выклікалі ў дэканат ўніверсітэта. Праз некаторы час у кабінеце намесніка дэкана з'явіліся два капітана КДБ таварышы Пяцэвіч і Касцюкевіч. Размова з хлопцам доўжылася каля гадзіны. Напрыканцы размовы "чэкісты" прапанавалі юнаку выбар: "спыняеш грамадска-палітычную дзейнасць — ўсё будзе добра, пакінем размеркаванне туды, куды ты хочаш, у адваротным выпадку паедзеш на Гомельшчыну ў Чарнобыльскую зону". Трэцім варыянтам была прапанова супрацоўнічаць і мець адпаведную падтрымку у кар'ерным росце. Супрацоўнікі спецслужбы папярэдзілі пра непажаданасць з'яўлення зместу гутаркі ў СМІ. У выніку Алег Пронскі прыняў рашэнне не здавацца і працягваць сваю грамадска-палітычную дзейнасць дзеля будучыні Мастоўшчыны.

## Гарадзеншчына паселянее

**Каля 2,5 мілёнаў кветак, 13 тысяч кустоў і 8 тысяч дрэваў з'явіцца на Гродзеншчыне на працягу года.**

Пасадка новых кветак і дрэваў прымеркавана да правядзення сёлета Года роднай зямлі. У спісе мерапрыемстваў — будаўніцтва 25 і добраўпарадкаванне больш за 150 пляцовак для адпачынку ўздоўж дарог вобласці, вызваленне ад смецця 15 тысяч гектараў лесу, аднаўленне лесу на 3 тысячах гектараў, з'яўленне 40 пляцовак для стаянак аўтатранспарта ў зонах адпачынку.

**Паводле БЕЛТА**

**АПЫТАННЕ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ САЙТА masty.belarda.org**

Як Вы ўспрынялі дэвальвацыю беларускага рубля?




## 110 банкрутаў за 2008 год

**За мінулы год у Гарадзенскай вобласці збанкрутаваліся 110 прадпрыемстваў і індывідуальных прадпрымальнікаў. Аб гэтым стала вядома на нарадзе Гарадзенскага абласнога гаспадарчага суду.**

Усяго ў 2008 годзе суд прыняў да вытворчасці 152 заявы аб эканамічнай безгрунтоўнасці, а гэта амаль у два разы больш, чым у 2007 годзе. Па 110 з іх вынесенае рашэнне аб ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання. Пры гэтым сярод даўжнікоў не апынулася ні аднаго дзяржаўнага прадпрыемства. Справы ўзбуджаліся ў адносінах да юрыдычных асоб прыватнай формы ўласнасці — замежных і сумесных прадпрыемстваў, індывідуальных прадпрымальнікаў. Больш за ўсё банкрутаў у сферы гандлю.

**Паводле Вячэрняя Горадня**

## Праблема недахопа лекараў не вырашаецца

**Істотны недахоп кваліфікаваных лекараў назіраецца на Гарадзеншчыне. Занепакоеныя ўлады пакуль не знайшлі ніякага спосабу прыцягнення маладых спецыялістаў, у сувязі з чым шырока карыстаюцца паслугамі пенсіянераў.**

Недахоп спецыялістаў на лекарскіх пасадах складае на Гарадзеншчыне 17,5 %. Улічваючы тое, што 15% працуючых лекараў - пенсіянеры, кадравае пытанне выглядае больш чым сур'ёзна.

Праблема недахопу лекараў відавочна турбуе ўлады вобласці, якія ў якасці рэцэпту прапануюць стымуляваць матэрыяльную зацікаўленасць медыкаў і вырашаць іх сацыяльныя пытанні.

Невысокія заробкі лекараў, перад усім супрацоўнікаў паліклінік, вымушаюць іх шукаць больш прыбытковую працу, у сувязі з чым многія маладыя спецыялісты-медыкі пасля абавязковай адпрацоўкі звальняюцца з пасадаў і у пошуках лепшай долі з'яжджаюць за мяжу.

**Радыё Рацыя**

## Мастоўскі конкурс прыгажосці

**На Мастоўшчыне распачаўся першы рэгіянальны інтэрнэт-конкурс прыгажосці пад назвай Lady of Mosty city 2009.**

"Дадзеная ініцыятыва ставіць на мэце абрацьсамую прыгожую і абаяльную дзяўчыну Мастоўшчыны. Гэта першы конкурс прыгажосці ў электронным фармаце. Па выніках конкурсу мы прымем рашэнне ці працягваць яго ў наступным годзе і ці будзе пашыраны фармат конкурсу." — паведаміў арганізатар Андрэй Гайдукевіч.

Вынікі конкурсу будуць падведзены, а пераможца ўзнагароджана 5 траўня 2009 года.

Узяць удзел у конкурсе можна ў інтэрнэце па адрасе http://vkontakte.ru/club7319067

Падрабязнасці аб умовах удзелу ў конкурсе можна даведацца па тэлефонах:

МТС + 375 29 783 86 44 альбо velcom +375 29 99 77 567

# Радыялагічнае даследванне ў Мастах

**14 студзеня ў Мастах у рамках кампаніі «За Еўрапейскую Мастоўшчыну» адбылося радыялагічнае даследванне жыхароў горада. Даследванне было арганізавана рэгіянальным каардынатарам ПАГА Рух «За Свабоду» у Гарадзенскай вобласьці Аляксандрам Зарэмбюком і Інстытутам Радыяцыйнай Бяспекі Беларусі пад кіраўніцтвам акадэміка НАН Беларусі, прафесара Івана Нікітчанкі.**



За 2 з паловай гадзіны даследванне на ўтрыманне ў арганізме радыяцыі прайшлі 27 мастаўчан. З 27 чалавек толькі ў 3 - ох не было выяўлена радыяцыі ў арганізме. Кожны з даследваных атрымаў даведку з утрыманнем дозаў радыяцыі ў сваім арганізме, а таксама парады і кансультацыі навуковых супрацоўнікаў Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі.

Мэтай радыялагічнага даследвання жыхароў Мастоўшчыны быў аналіз радыяцыйнага забруджвання прадуктаў харчавання, якія прадаюцца ці растуць на тэрыторыі Мастоўскага раёна, а таксама аналіз уплыву малых дозаў радыяцыі на арганізмы мастаўчан.

Даследванне праводзілася на спецыяльным радыялагічным абсталяванні — аўтаматызаваным комплексе спектраметры ўнутранага выпраменьвання чалавека якое каштое 28 000 даляраў і мусіць быць у кожнай раённай бальніцы ўлічваючы наступствы аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі.

## Сустрэча супраць будаўніцтва АЭС забароненая



**Райвыканкам забараніў праводзіць сустрэчу з людзьмі ў кінаканцэртнай залі "Астравец" дзеля абмеркавання пытання пабудовы АЭС у рэгіёне.**

Прыхільнікі Руху "За Свабоду" і актывісты кампаніі "Астравецкая атамная — гэта злачынства" Мікола Уласевіч і Іван Крук атрымалі адмоўны адказ на сваю заяву аб правядзенні 17 студзеня у КЗ "Астравец" грамадскага абмеркавання мэтазгоднасці пабудовы атамнай станцыі з удзелам адмыслова запрошаных экспертаў.

Старшыня Астравецкага райвыканкама сп. Кавалько ў сваім лісце паведамляе, што заяўленае актывістамі месца у адпаведнасці з рашэннем райвыканкама ад 23 лістапада 1999 году вызначана толькі "для правядзення масавых мерапрыемстваў, звязаных з дзяржаўнымі святамі Рэспублікі Беларусь".

На думку Івана Крука сапраўдная прычына іншая. Улады ўвесь час усімі магчымымі сродкамі імкнуцца перашкодзіць кампаніі па збору подпісаў супраць пабудовы АЭС. Да сябраў ініцыятыўнай групы і нават да тых, хто наважыўся падтрымаць актывістаў кампаніі сваім подпісам, прыходзяць чыноўнікі, супрацоўнікі спецслужбаў. На людзей робяць сур'ёзны псіхалагічны ціск, патрабуючь адмовіцца ад сваёй пазіцыі.

**Прэс-служба Руху «За Свабоду»**

## У студзені банкаўскія ўклады насельніцтва ў беларускіх рублях скараціліся амаль на 14%

**У студзені ўклады насельніцтва ў беларускіх рублях скараціліся на 13,8% і на 1 лютага склалі прыблізна 6,7 трлн. рублёў.**

Дэпазіты ў замежнай валюце, наадварот, павялічыліся на 11,6% — у эквіваленце 2,8 млрд. даляраў ЗША.

Як паведамілі БелаПАН ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка, такая статыстыка тлумачыцца тым, што ў Беларусі са снежня 2008 года адзначаецца тэндэнцыяператоку рублёвых укладаў насельніцтва ў інвалютныя. Гэта, у сваю чаргу, абумоўлена ростам курсу даляра ЗША.

У цэлым, паводле звестак Нацбанка, за студзень гэтага года рублёвыя і інвалютныя ўклады насельніцтва ў беларускіх банках павялічыліся больш чым на 1 трлн. рублёў, або 7,8%. На пачатак лютага яны дасягнулі амаль 14,3 трлн. рублёў.

Асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2009 год прадугледжваецца прырост дэпазітаў фізічных асоб у 4,2—5,2 трлн. рублёў.

**Аляксей Арэшка, БелаПАН**

## Чаму чыноўнікі супраць памятнай шыльды?

**Мастоўскія ўлады не дазволілі актывістам Руху "За Свабоду" усталяваць памятны знак на месцы былога габрэйскага гета.**

Сябра Рады ПАГА Рух "За Свабоду" Алесь Зарэмбюк атрымаў адмову на сваю прапанову размясціць памятны знак з надпісам на беларускай мове на месцы знаходжання пад час Другой сусветнай вайны габрэйскага гета каля вёсцы Луна Мастоўскага раёна.

Старшыня райвыканкама Аляксей Шафарэфіч паведаміў у сваім лісце, што знак у памяць растраляных габрэяў у вёсцы Луна ўсталяваны летам 2005 года. Усталяванне, па словах чыноўніка, было ўзгоднена з Саюзам беларускіх габрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і размяшчаць яшчэ адну шыльду не мае патрэбы.

Як высветлілі актывісты Руху, на сённяшні дзень непасрэдна на месцы расстрэлу габрэяў ніякага памятнага знаку няма. Той, што ёсць, месціцца ў супрацьлеглым баку ад месца трагедыі і ўсталяваны ў 2005 годзе дзякуючы намаганням грамадскасці, а не чыноўнікаў.

— Гэтая ініцыятыва была прапанавана дэпутаткай Луненскага сельскага Савета дэпутатаў Валянцінай Карповіч яшчэ ў 2004 м годзе. Тады дэпутатка Луненскага сельскага Савета дэпутатаў 24 склікання Валянціна Карповіч выносіла на разгляд сесіі Луненскага сельскага Савета дэпутатаў гэтае пытанне, яе падтрымлівалі і іншыя дэпутаты, у тым ліку камуніст Аляксандр Пудаўкін. 5 гадоў таму, мясцовыя ўлады адмовілі дэпутатам у размяшчэнні помніка ахвярам гета на месцы расстрэлаў. Зараз памятны знак знаходзіцца абсалютна ў другім баку ад таго месца, дзе ў гады вайны знаходзілася гета, а канкрэтна — па вул. Кірава. Валянціна Карповіч настойвала, каб надпіс на памятным знаку быў нанесены на беларускай і габрэйскай мовах. У выніку, улады зрабілі камень на рускай мове, а праз некаторы час з ініцыятывы сваякоў габрэяў, якія жылі ў Луне, быў нанесены яшчэ адзін надпіс па габрэйску, тэкст якога быў узгоднены з кіраўніком Беларускага габрэйскага саюза грамадскіх аб'яднанняў і абшчын Леанідам Левіным, — распавядае Алесь Зарэмбюк.

Алесь Зарэмбюк выказвае шкадаванне, што Аляксей Шафарэвіч, не ўбачыў неабходнасці ў аднаўленні гістарычнай праўды і ўшанавання памяці загінуўшых жыхароў мястэчка Луна. Зараз актывісты рыхтуюць новы зварот на імя старшыні Мастоўскага райвыканкама, дзе будуць выкладзены дадатковыя гістарычныя факты, з надзеяй змяніць меркаванне чыноўніка і нарэшце дазволіць аднавіць гістарычную праўду і памяць пра невінна загінушых 1549 жыхароў Луны.

## Лукашэнка ў лістападзе 2008 года: «Ніякага абвалу рубля не будзе»

**2 студзеня беларусы былі шакаваныя: нягледзячы на ўсе заявы ўладаў нацыянальная валюта абрынулася на 20,5 адсотка. Зусім нядаўна Лукашэнка кляўся, што «абвал» рубля ніколі не адбудзецца.**

Прапануем вам заявы беларускага дыктатара на гэтую тэму.

"Улада не дапусціць абвалу і хаосу, не здрадзіць вашаму даверу. Мы ніколі не здрадзім свайму прынцыпу - клопат аб чалавеку".

**Навагодні выступ, 31 снежня 2008 года.**

"Мы павінны зрабіць так, каб гэты сусветны фінансавы крызіс прайшоў убаку — не мы яго стварылі. У нас не павінна быць крызісу. Мы гэтага не заслужылі".

**29 снежня, прызначаючы старшыню Магілёўскага аблвыканкама.**

"Беларусь гэты крызіс не захліснуў".

**23 снежня, адказваючы на пытанні журналістаў у г.Бяроза Берасцейскай вобласці.**

"Сёння галоўнае — утрымаць стабільнасць. Стабільнасць рубля, а значыць, стабільнасць усёй фінансавай сістэмы. Мы дасягнулі 2200. Усё, нельга больш. Мы народу абяцалі. І я сказаў старшыні Нацбанка - май на ўвазе, не дай Бог, маё слова будзе парушана. Прыйдзе новы год - 5 адсоткаў... Вось вазьміце 5 адсоткаў ад 2200".

**18 снежня, у інтэрв'ю рэдактарам дзяржаўных СМІ.**

"Сітуацыя ў краіне не крызычная, і яе трэба захаваць. Улада зробіць ўсе неабходныя высілкі і ўжо зрабіла нямала. Зараз усё залежыць ад людзей, як яны сябе будуць паводзіць. Калі людзі разумеюць уладу, прэзідэнта, будуць верыць, дык ўсё будзе нармальна".

**18 снежня, у інтэрв'ю рэдактарам дзяржаўных СМІ.**

"Нам трэба перажыць 2009-2010 гады, адчуваю, што гэтыя два гады будуць няпростыя, але і панікаваць не трэба. Сітуацыя ў краіне кіраваная. Мы сваіх людзей не кінем".

**16 снежня, падчас працоўнай паездкі ў Менскую вобласць, у размове з жыхарамі Беразіна.**

"Сёння мы задаволеныя, радыя з таго, што мы так не ўцягнутыя ў гэты фінансавы крызіс, які перакуліў шмат якія дзяржавы. Я яшчэ раз хачу паўтарыць: крызіс - гэта не для нас".

**4 снежня, падчас сустрэчы з кіраўнікамі Саўміна і Нацбанка Сяргеем Сідорскім і Пятром Пракаповічам.**

"У нас не было велізарных запазычанасцяў за мяжой. Таму мы неяк убаку засталіся ад гэтага крызісу".

**24 лістапада, у інтэрв'ю агенцтву Франс Прэс.**

"Што датычыцца беларускага рубля, дык сітуацыя абсалютна стрымліваецца. Сёння важна падтрымаць курс беларускага рубля. Ніякага абвалу рубля не будзе, усё — у зададзеных параметрах, у тым ліку і гадавая дэвальвацыя. Беларуская мадэль эканамічнага развіцця змагла нейтралізаваць уплыў сусветнага крызісу".

**25 лістапада, на нарадзе з актывам Віцебскай вобласці.**

# Адбылася прэс-канферэнцыя ПАГА “Рух “За Свабоду”

**14 студзеня адбылася прэс-канферэнцыя ПАГА “Рух “За Свабоду”. На пытанні журналістаў адказалі лідэр грамадскага аб'яднання Аляксандр Мілінкевіч, а таксама ягоныя намеснікі Юры Губарэвіч і Віктар Карнеенка.**



На прэсавай канферэнцыі прысутнічалі журналісты агенцый “БелаПАН”, “Інтэрфакс”, выданняў “Наша Ніва”, “Народная Воля”, “Беларусы і Рынак”, “Салідарнасць ”,“Мастоўская праўда” радыё “Нямецкая хваля”, “Польскага радыё”, “Радыё Рацыя”, тэлевізіі “Белсат” і інш.

Журналістаў цікавілі пытанні, звязаныя з далейшай дзейнасцю Руху “За Свабоду” пасля афіцыйнай рэгістрацыі аб'яднання, а таксама ва ўмовах так званай лібералізацыі і сусветнага фінансавага крызісу, які сур'ёзна адбіваецца на стане беларускай эканомікі.

Прысутных таксама цікавілі пытанні, якія датычаць бліжэйшых прэзідэнцкіх выбараў. Лідэр Руху падцвердзіў свой намер вылучацца ў якасці кандыдата і выказаў меркаванне, што у выбарчай кампаніі будуць незалежна удзельнічаць тры палітычныя сілы: прарасейскія, праеўрапейскія і праўладныя.

## Канкурэнтную мойку ліквідавалі

**Мастоўскае раённае спажывецкае таварыства разарвала дамову арэнды памяшкання, дзе месцілася адзіная ў Мастах прыватная аўтамойка. 26 га студзеня прыватнае тарговае ўнітарнае прадпрыемства “Мір Кір” і мастоўскае райспажыўтаварыства падпісалі акт здачы памяшкання былой аўтамойкі. Зараз гэтае памяшканне не выкарыстоўваецца.**

Уласнік памяшкання, мастоўскае райспажыўтаварыства папярэдзіла ПТУП “Мір Кір” за месяц аб спыненні дамовы арэнды памяшкання ў сувязі з тым, што яны адкрываюць на тэрыторыі аўтакалоны сваю аўтамойку і таму спыняюць дамову арэнды з сваім патэнцыйным канкурэнтам — прыватнай аўтамойкай, якая належыла прыватнаму прадпрыемству “Мір Кір”.

Прыватная аўтамойка, якая месцілася побач з аўтадромам перастала працаваць з 24 - га студзеня. Негледзячы на гэта, дамова на арэнду памяшкання для мыцця машын заканчвалася толькі ў маі месяцы 2009 года. Райспажыўтаварыства спыніла дзеянне дамовы ў аднабаковым парадку, каб ліквідаваць канкурэнта, пра што паведаміла у афіцыйным лісце на імя кіраўніцтва прыватнага тарговага прадпрыемства “Мір Кір”.

Негледзячы на гэта, сітуацыя з мойкай аўтамабіляў у Мастах напружаная, і праца двух моек, райпоўскай і прыватнай толькі б паменшыла чэргі аўтаўладальнікаў на мыццё аўтамабіляў, якія дагэтуль назіраюцца каля адзінай аўтамойкі ў Мастах.

Ліквідацыя прыватнай мойкі, пазбавіла працы як мінімум адну працоўную, якая мыла аўтамабілі на прыватнай мойцы, раённы бюджэт згубіў штомесячны падатак ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, а райспажыўтаварыства недаатрымлівае 350 тысяч рублёў у месяц за арэнду памяшкання, якое зараз нікім невыкарыстоўваецца.

У выніку, жыхары Мастоўшчыны ў чарговы раз пазбаўлены права выбара. Замест таго каб, выбіраць мойку сыходзячы з якасці абслугоўвання і кошту паслугі, мы вымушаны мець справу з манапалістам і адстойваць доўгія чэргі дзеля таго, каб ездзіць на чыстым аўтамабілі. Там дзе няма канкурэнцыі, няма добрых коштаў і бездакорнай якасці. Як паказвае мастоўскае практыка, прадпрымальніцкая ініцыятыва спыняецца на карню, негледзячы на курс эканамічнай лібералізацыі ажыццяўляемы кіраўніцтвам краіны.

# Хто скупіў даляры напярэдадні «абвалу» рубля?

**2 студзеня Нацыянальны банк рэзка дэвальваваў рубель. Адначасова ў канцы снежня сітуацыя на біржы складалася парадаксальным чынам.**



Напрыклад, 23 снежня на валютным гандлі БВФБ адбыўся загадкавы катаклізм — чыстая прапанова на продаж даляраў ЗША склала 7,338 млн., у 5,8 разоў перавысіўшы попыт, паведамляў АФН. Адначасова на інтэрнэт-форумах з'явілася інфармацыя, што ў апошнія дні снежня адбылася масавая скупка даляраў на валютнай біржы.

З улікам “абвалу” беларускага рубля і рэзкага падаражэння даляра ў Беларусі на гэтай аперацыі хтосьці змог зарабіць велізарныя грошы. Пракаментаваць гэтую інфармацыю прэс-цэнтр Хартыі'97 папрасіў вядомых экспертаў.

Аглядальнік газеты “Беларусы і рынак” Кастусь Скуратовіч адзначыў, што верагоднасць таго, што той, хто ведаў аб дэвальвацыі, якая мае адбыцца, будзе скупляць валюту, “вельмі высокая”. Паводле яго словаў, такія аперацыі праводзяцца “дасведчанымі” людзьмі нават у дэмакратычных краінах, у Расеі ж гэта адбываецца ўвесь час.

“Магу толькі выказаць здагадку, што такую аперацыю маглі правесці людзі, якія валодалі інфармацыяй аб дэвальвацыі рубля, што мае адбыцца. Не здзіўлюся, калі пасля навагодніх святаў, калі грамадскасць ачомаецца, нас чакаюць вялікія выкрыцці. Магчыма, гэтая чутка пайшла не выпадкова. Мы цалкам можам пачуць, што былі нейкія махінацыі і кагосьці адвядуць пад белыя ручкі”, -- адзначыў Кастусь Скуратовіч.

Былы старшыня Нацыянальнага банка Беларусі Станіслаў Багданкевіч лічыць, што, калі інфармацыя аб масавай скупцы даляраў дакладная, дык такія аперацыі маглі рабіць людзі, якія ведалі аб дэвальвацыі, што мае адбыцца.

“Калі гэтулькі было скуплена, дык, мабыць, прасачылася дзесьці інфармацыя аб тым, што будзе дэвальвацыя курсу. Інакш я сумняюся, што была б скупленая такая сума грошай. Валодаць такой інфармацыяй мог, вядома, той, хто рыхтаваў дэвальвацыю. Вядома, усё гэта варажба на кававай гушчы. Падчас майго перабывання старшынём Нацбанка ў мяне быў адзіны курс, а калі ёсць адзіны курс, ні аб якіх спекуляцыях не можа і быць і гаворкі. Я усталяваў адзіны курс, каб спыніць усялякую магчымасць спекуляцыяў. Калі ўрад усталёўваў некалькі курсаў валюты: для медыкаментаў - адзін, для нафты - другі, для газу — трэці (і гэта не банк усталёўваў, а усталёўвала ўлада) і раздаваў усялякія “цыдулкі”, каб прадаць таму, таму ці таму для нейкіх мэтаў, гэта заўсёды суправаджалася карупцыяй.

Калі курс паднялі ці апусцілі, заўсёды можна пажывіцца, калі мэту такую пераследваць, але падчас майго перабывання такіх змяненняў курсу не было, таму што мы ўвялі валюту толькі ў канцы 1994 года, і ў 1995 годзе быў усталяваны адзіны і нязменны курс па ўсёй краіне. Таму тады і не было гаворкі аб спекуляцыях.

Спекуляцыі бываюць заўсёды, калі хтосьці ведае, што заўтра курс узнімецца, паслязаўтра апусціцца і гэтак далей.

Я ужо казаў журналістам, што сам быў уведзены ў зман, таму што вельмі ўжо сумленна казаў Аляксандр Лукашэнка, што не будзе абвалу ў новым годзе. Я лічыў, што пакольки крэдыт Міжнародны валютны фонд даў, ідзе мільярд крэдыту ад Расеі, дык можна рабіць маленькую дэвальвацыю, плаўную. І “абвал” для мяне быў нечаканасцю, як і для ўсіх астатніх. Я не бег у абменнік нешта абменьваць. А наогул трэба ведаць сітуацыю, усё гэта можа быць спекуляцыямі на чутках. Хаця, вядома, хто рыхтаваў дэвальвацыю, той ведаў, што рабіць”, -- сказаў былы кіраўнік Нацбанка.

## Траціну злачынстваў на Гарадзеншчыне робяць былыя сядзельцы

**Траціну злачынстваў на тэрыторыі Гарадзеншчыны здзяйсняюць асобы, якія раней адбывалі тэрміны турэмнага зняволення. Прычым, гэты паказчык з кожным годам павялічваецца.**

Паводле дадзеных пракуратуры Гарадзенскай вобласці, амаль 4000 злачынстваў здзейсніл асобы, якія раней прыцягваліся да крымінальнай адказнасці. Дадзеная катэгорыя злоўмыснікаў на працягу года ажыццявіла 17 забойстваў з 62, 30 цяжкіх цялесных пашкоджанняў і 168 рабаванняў.

Бадай што самым распаўсюджаным злачынствам на Гарадзеншчыне з'яўляецца крадзеж тэлефонаў — на працягу года зафіксавана 2064 выпадкі. Больш за ўсё крадзяжоў зарэгістравана ў Кастрычніцкімм раёне Гародні — 601.

Як адзначаюць супрацоўнікі праваахоўных органаў, абсалютну большасьць злачынстваў грамадзяне здзяйсняюць на падпітку. Тэндэнцыя прасочваецца з года ў год, але зменаў да лепшага пакуль не назіраецца.

Радыё Рацыя

## НББ!НББ!НББ!

**Скандаваннем гэтых трох літар скончыўся раённы турнір па мініфутболу сярод аматарскіх каманд, які праходзіў у спорткомплексе горада Масты.**

27 студзеня прайшлі фінальныя гульні турніру.За трэцяе месца змагаліся каманда “РОЧС” супраць каманды “Лятучы галандзец”. Ва ўпартай барацьбе перамога дасталася камандзе “РОЧС”, якая на апошніх хвілінах вырвала яе з рахункам 6:3.

У фінале сустрэліся мацнейшыя каманды турніру:“НББ” і “Строймаркет”. Нягледзячы на досвед гульцоў каманды “Строймаркет” і прадузятага стаўлення суддзі да каманды-суперніка, каманда “НББ” аказалася мацней. Рахунак на табло пасля фінальнага свістка суддзі толькі пацвердзіў гэта. Гульня скончылася з рахункам 4:0 на карысць “НББ”,што выклікала буру авацый на трыбунах.

Прызёры турніру былі ўзнагароджаныя памятнымі падарункамі і медалямі,а пераможцы спаборніцтваў атрымалі галоўны прыз-кубак з рук арганізатара спаборніцтваў намесніка страшыні мастоўскага райвыканкама Сяргея Пятровіча Кухлея.

Арцём Вініцкі

# Камунальныя парадкі

**26 га студзеня жыхары дома па вуліцы Зялёная ўбачылі перад сваім домам звыклую карціну: у чарговы раз раскапаную лінію цеплатрас і працоўных ЖКГ.**

Замена і рамонт труб тут праводзіцца з незайздросным пастаянствам — амаль штогод. Праўда сёлета камунальшчыкі "парадавалі" яшчэ больш: апошнія "раскопкі" праводзіліся 2 месяцы таму і зараз усё было раскапана наноў.

Пацікавіўшыся ў аднаго з працоўных, што здарылася на гэты раз, я атрымаў апэратыўны адказ: "планавая замена труб".

Гэта канешне добра, што трубы рамантуюць згодна плана амаль кожны год.

Вось толькі хацелася каб гэтыя рамонтныя работы праводзіліся аператыўна.

Яму раскапалі, трубы адрамантавалі, а закапаць забылі?!

Два тыдні цеплатраса стаяла раскапаная м ніякіх працаў на гэтай тэрыторыі не праводзілася.

Дрэнна, што па плану камунальных службаў і мастоўскіх уладаў не закладзены рамонт асфальтавага пакрыцця, пасля праведзення такіх рамонтаў і заменаў.

Стан дарожнага пакрыцця двара паграшаецца, а ў гэты час падвескі аўтамабіляў жыхароў усё часцей ламаюцца.





Ды і эстатчына раскапаны двор выглядае вельмі непрыгожа.

**Міхаіл Лявонаў**

# Больш хворых - больш грошаў

**Нягледзячы на фінансавы крызіс, на службы аховы здароўя Гарадзеншчыны сёлета мае быць выдаткавана каля 600 мільярдаў рублёў. Грошы часткова пойдуць на далейшую пабудову ды рэканструкцыю дзіцячага шпіталю ды кардыялагічнага цэнтру ў Гародні.**

У набыцці новага медычнага абсталявання для шпіталяў мае дапамагчы Міністэрства аховы здароўя Беларусі. У прыватнасці, набудуць апарат для брахіятэрапіі, неабходны для лекавання хворых на рак. Па словах начальніка Упраўлення аховы здароўя гарадзенскага аблвыканкаму Ільлі Епіфанава, сёлета медыкі асаблівую ўвагу звернуць на анкалагічна хворых. Летась прайшло дыспансерызацыю 97 адсоткаў насельніцтва Гарадзенскай вобласці, падчас якога выяўлена вялікая колькасць людзей з рознымі, у тым ліку і хранічнымі захворваннямі. Статыстыка нярадасная — на дыспансэрны ўлік пастаўлена звыш 436 тысяч чалавек, якія цяпер будуць знаходзіцца пад перыядычным наглядам лекараў.

**Радыё Рацыя**

# Рэйтынгі Беларусі ў 2008-м годзе

**Якое месца Беларусь займала сёлета ў рэйтынгах міжнародных арганізацый?**

"Freedom House". Справаздача аб становішчы з правамі чалавека ў сьвеце. 193 краіны

Беларусь — у катэгорыі несвабодных краінаў у дванаццаты раз ад 1996 году, калі "Freedom House" пачала рабіць свае ацэнкі. З суседзяў Беларусі ў гэтую катэгорыю патрапіла таксама Расея, іншыя 4 краіны — Літва, Латвія, Польшча і Украіна былі ацэненыя, як свабодныя.

"Freedom House". Справаздача аб свабодзе друку ў сьвеце. 195 краін.

З 28 краінаў Цэнтральнай і Усходняй Эўропы і краінаў былога СССР паводле ўзроўню свабоды друку Беларусь займае 26 месца, апярэджваючы толькі Туркмэністан і Узбэкістан.

Беларусь — 188 месца (краіна зь несвабодным друкам), знаходзіцца ў рэйтынгу паміж Узбэкістанам і Зімбабвэ.

Расея — 170 месца (краіна зь несвабодным друкам)

Украіна — 110 месца (краіна з часткова свабодным друкам)

Польшча — 51 месца (краіна свабоднага друку)

Латвія — 40 месца (краіна свабоднага друку)

Літва — 25 месца (краіна свабоднага друку).

"Freedom House". Справаздача аб стане дэмакратычных свабодаў у пераходных дзяржавах сьвету "Nations in Transit 2008".

Ацэнкі свабодаў паводле шкалы ад 1 (найвышэйшая ступень разьвіцьця) да 7 (найніжэйшая).

**Беларусь**

выбарчы працэс — 7

грамадзянская супольнасьць — 6.5

незалежнасьць сродкаў масавай інфармацыі — 6.75

незалежнасьць судовай улады — 6.75.

"Рэпартэры бязь межаў". Усясьветны рэйтынг свабоды друку. 173 краіны.

Беларусь — 154 месца
Расея — 141 месца
Украіна — 87 месца
Польшча — 47 месца
Літва — 16 месца
Латвія — 7 месца.

Паводле "Рэпартэраў бязь межаў", самыя кепскімі краінамі ў сэнсе свабоды слова ў 2008 годзе былі Паўночная Карэя і Эрытрэя.

Brookings Institution. Ацэнка слабасьці (неэфэктыўнасьці) дзяржавы. 141 краіна.

Чым вышэй месца ў рэйтынгу, тым болей эфэктыўнай зьяўляецца дзяржава.

Беларусь — 81 месца
Польшча — 135 месца
Латвія — 136 месца
Літва — 138 месца
Украіна — 107 месца
Расея — 65 месца.

Усясьветны банк. Справаздача "Doing Business 2009" аб умовах вядзеньня бізнэсу. 181 краіна.

Беларусь названая ў чацьвёрцы найбольш пасьпяховых краін-рэфарматараў.

У параўнаньні з папярэднім пэрыядам Беларусь паднялася са 115 на 85 месца.

"Transparency International". Штогадовая справаздача аб ўзроўні карупцыі.

**Беларусь:**

У 1998—2002 гадах — сярод 50 краінаў з найменшай карупцыяй у сьвеце,

2003 — 53 месца
2004 — 74 месца
2005 — 107 месца
2006 — 151 месца
2007 — 150 месца.

**2008 год:**

Беларусь — 150 месца
Расея — 147 месца
Украіна — 134 месца
Польшча — 58 месца
Латвія — 52 месца
Літва — 58 месца.

## Гродзенская міліцыя праводзіць маштабную акцыю ў вобласці

**Месячнік па прадухіленні побытавых злачынстваў распачала міліцыя ў Гродзенскай вобласці.**

На працягу лютага спецыяльна створаныя рэйдавыя групы возьмуць пад кантроль праблемныя сем'і, кватэры групы рызыкі, асацыяльных асобаў. Падлічаць і паставяць на ўлік сямейных скандалістаў, хранічных алкаголікаў і наркаманаў, раней асуджаных і непаўналетніх, якія здзяйснялі злачынствы.

Па статыстыцы палова цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў на Гродзеншчыне робіцца нападпітку. Таму адным з дзейсных сродкаў барацьбы з побытавымі злачынствамі супрацоўнікі міліцыі лічаць накіраванне хранічных алкаголікаў у лячэбна-прафілактычныя прафілакторыі. За мінулы месяц 104 жыхары Гродзеншчыны былі накіраваны на прымусовае лячэнне ад алкагалізму. Кожная пятая з іх — жанчына.

**Твой Стыль**

# Тэрмін адпрацоўкі могуць павялічыць да 5 год

**Выпускнікам вну могуць павялічыць тэрмін адпрацоўкі да 5 год. Савет міністраў збіраецца павялічыць тэрмін адпрацоўкі па мэтавым кантракце і скараціць падставы для выдачы даведкі аб самастойным працаўладкаванні.**

Пастановай Савета міністраў №8 ад 8 студзеня 2009 года прадугледжаная рэалізацыя шэрагу мерапрыемстваў для прыцягнення спецыялістаў у сельскагаспадарчыя арганізацыі рэспублікі, паведамляе БелТА.

Плануецца падвысіць заробак працаўнікам сяла, стварыць механізм іх рэальнай зацікаўленасці ў эканамічных выніках дзейнасці прадпрыемства, палепшыць забяспечанасць жыллём, распрацаваць галіновыя навукова-абгрунтаваныя нормы колькасці розных катэгорый працаўнікоў сельскагаспадарчай галіны ў адпаведнасці з узроўнем тэхпераабсталявання, навуковай арганізацыі вытворчасці і працы.

Мяркуецца разгледзець пытанне аб прыёме выпускнікоў ПТВ у вну на скарочаны тэрмін навучання, прымаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профіля да 20% абітурыентаў з сельскай мясцовасці і залічаць іх па асобным конкурсе.

Таксама будуць павялічаны аб'ёмы мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў (да 30% ад кантрольных лічбаў прыёму ва ўстановы адукацыі), тэрмін адпрацоўкі па мэтавым кантракце (да 5 год - для спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, да 3 год - для спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, да 2 год - для працоўных (службоўцаў). Збіраюцца скараціць падставы для выдачы даведкі аб самастойным працаўладкаванні і вызваленні ад пакрыцця бюджэтных сродкаў за навучанне ў вну і ссну і ўзмацніць адказнасць за скасаванне дамовы аб мэтавай падрыхтоўцы.

**Ул. інф.**

# Мастоўскія камунальнікі месяц незаконна рубілі лес

**Другога лютага „Сталічнае тэлебачанне" паказала рэпартаж аб мастоўскіх камунальніках, якія у пошуку мясцовых відаў паліва, цэлы месяц займаліся незаконнай вырубкай дрэў.**



Насекчы, магчыма, атрымалася б і больш, калі бы не умяшаўся мясцовы лясгас, які і выявіў адсутнасць ліцэнзіі. Зараз гаворка ідзе аб шматмільённым штрафе за таннае і, здавалася б, даступнае паліва.

Нелегальная рубка лесу — з'ява для інспектараў звыклая. Але і яны былі здзіўленыя маштабамі незаконнай нарыхтоўкі драўніны. Добра экіпіяваная брыгада да моманту затрымання, ужо паспела паваліць некалькі дзясяткаў дрэў. Лесарубамі-нелегаламі аказаліся працаўнікі мясцовага ЖКГ. Лес яны нарыхтоўвалі на дровы. І свой занятак супрацьзаконным зусім не лічылі.

Незаконную вырубку камунальнікі тлумачаць проста. На нарыхтоўку драўніны ў іх з лясгасам падпісана дамова. Праўда аб тым, што тэрмін яе дзеяння скончыўся яшчэ 31 снежня 2008 года яны імкнуцца не ўспамінаць. У выніку цэлы месяц працаўнікі ЖКГ пілавалі дрэвы нелегальна.

Законнай вырубка лічылася толькі да новага года. Мясцовы лясгас сапраўды выдзяліў прадпрыемству дзялянку. А дрэвы, якія можна было пілаваць, нават адмыслова пазначылі. У дамове было запісана і колькасць драўніны, якую планавалася загатовіць Адзіная ўмова — працы павінны завяршыцца ў снежні. Тое, што трапіліся цяпер, у ЖКГ лічаць чыстай выпадковасцю. Быццам бы і не пілавалі , а проста абразалі па памеры раней ссечаныя дрэвы .

За такое, па меркаванні камунальнікаў, малаважнае парушэнне прадпрыемства чакаюць сур'ёзныя санкцыі. А менавіта шматмільённы штраф. Ці паслужыць гэта ўрокам для гора-лесарубаў — пакажа час.

**Паводле СТБ**

# Журналісту "Gazeta Wyborcza" парэзалі дзьверы

**Журналіст польскага выданьня "Gazeta Wyborcza" Андрэй Пачобут жыве на прыватнай кватэры ў сваёй роднай Горадні. Невядомыя парэзалі нажом уваходныя дзьверы кватэры.**



Андрэй Пачобут таксама расказаў, што ягонай васьмігадовай дачцэ на мабільны тэлефон некалькі разоў званіў невядомы мужчына. Спадар Пачобут сказаў яму, што напіша заяву міліцыю і адключыў тэлефон. На наступны дзень выявілася, што ўначы з таго ж нумару тэлефанавалі потым яшчэ тройчы.

Пастаянныя таксама званкі на гарадзкі тэлефон, калі бярэш слухаўку, ніхто не адказвае, толькі маўчаньне, прызнаўся журналіст. Дзякуючы аўтаадказьніку, яму вядома, зь якіх нумароў рабіліся званкі. Аднак, калі ён сам туды тэлефанаваў, ніхто не адказваў, а нумар мабільнага тэлефону, які таксама быў зафіксаваны, адразу адключылі.

Андрэй Пачобут гаворыць, што ў сям'і стварылася напружаная атмасфэра, дачка стала баяцца. Ён мяркуе, што ціск на сям'ю можа быць зьвязаны і зь яго журналісцкай дзейнасьцю, і з актыўным удзелам у працы Саюзу палякаў на чале з Анжалікай Борыс, які па-ранейшаму не прызнаецца беларускімі ўладамі.

**Сяргей Астраўцоў,**
**Радыё Свабода**

# Уладзімір Мацкевіч: Крызіс абуджае хутчэй апазіцыйныя настроі

**У той час, як ва ўсёй Еўропе з пачаткам крызісу актывізуюцца рухі левага кірунку, Беларусі, якая ідзе ў бок "лібералізацыі", гэта не пагражае**



Страйк, які распачаўся з канцы студзеня ў Францыі, прайшоў пад левымі лозунгамі, а ў Польшчы ствараецца левацэнтрысцкая кааліцыя. Палітолаг Уладзімір Мацкевіч патлумачыў Еўрарадыё, што гэта цалкам заканамерная рэакцыя грамадства на эканамічны крызіс.

Уладзімір Мацкевіч: "Крызісы заўжды абуджаюць левыя настроі і даюць ухіл у левы бок у палітыцы, калі людзі патрабуюць пэўнай стабільнасці, бяспекі. Я думаю, што гэта цалкам натуральная з'ява, яна не аднойчы паўтаралася ў свеце і гісторыі".

Але Беларусь - гэта хутчэй выключэнне з правіла, кажа Мацкевіч. Калі на вуліцу і выходзяць палітычна актыўныя грамадзяне, то пад ліберальнымі, цэнтрысцкімі лозунгамі. Найперш гэта абумоўлена тым, што сам беларускі рэжым "левай" скіраванасці, а таму апазіцыйныя сілы, якія мусяць прапанаваць альтэрнатыву дзейснай уладзе, не могуць кіравацца левымі ідэямі. Вось што гаворыць Уладзімір Мацкевіч:

"Але што тычыцца Беларусі - тут усё ж такі асаблівая сітуацыя. У Беларусі "левы" рэжым, вельмі "левага" такога накірунку. Крызіс абуджае хутчэй апазіцыйныя настроі, але крытыкаваць ці супрацьпастаўляцца "леваму" рэжыму ў гэтым, у гэтай сітуацыі, напэўна, складана пад "левымі" лозунгамі".

Цяперашняя сітуацыя ў Беларусі, па словах Мацкевіча, абумоўлена папярэдняй палітыкай уладаў.

Уладзімір Мацкевіч: "Сёння цалкам натуральна, што калі па ўсім свеце дзяржава ўмешваецца ў эканоміку і робіць "левыя" захады, то ў Беларусі ідзе лібералізацыя. Таму што гэта выклікана менавіта папярэдняй палітыкай і папярэднімі справамі".

Атрымліваецца, што камуністы і іншыя партыі "левых" поглядаў сёння маюць мала шанцаў, каб здабыць падтрымку беларускіх грамадзянаў. Немалаважным чыннікам, які змяншае колькасць прыхільнікаў альтэрнатыўных уладзе "левых" партыяў з'яўляецца тое, што бюджэтныя групы працаўнікоў, на якіх звыкла абапіраюцца гэтыя партыі, сёння актыўна падтрымліваюцца дзяржавай. Вось што гаворыць пра гэта Мацкевіч:

"Пакуль з бюджэтнікамі, з тым падмуркам, на якім магла б будаваць свой распаўсюд менавіта камуністычная партыя, ну з імі пакуль рэжым працуе, і камуністы ў гэтым сэнсе уплыву на іх не маюць".

**Сымон Каліза,**
**Еўрарадыё**



# Лібералізацыя па камандзе

**"Гроднааблсаюздрук" не змог уцямна растлумачыць прычыны адмовы распаўсюджваць "Газету Слонімскую" і "Новы час" праз свае шапікі.**

Сябра Рады ПАГА "Рух "За Свабоду" Алесь Зарэмбюк атрымаў адказ на свой ліст ад 13 студзеня да кіраўніцтва "Гроднааблсаюздруку" наконт таго, чаму "Газета Слонімская" і "Новы час" не распаўсюджваюцца праз дзяржаўную сістэму распаўсюду друкаваных выданняў. Дырэктар "Гроднааблсаюздруку" Тадэвуш Валчкевіч ў сваім адказе паведаміў, што не мае дамовы на распаўсюд названых выданняў, а рашэнне пра тое, складаць з рэдакцыямі гэтых газет дамову ці не, — прэрагатыва УП "Гроднааблсаюздрук".

Фактычна, чыноўнік адмовіўся назваць прычыны, па якіх дзяржаўны манапаліст па продажу друкаванай перыёдыкі не супрацоўнічае з незалежнымі газетамі, і даў зразумець, што гэта не справа чытачоў. Дырэктар "Гроднаабласаюздруку" таксама параіў пашукаць названыя газеты ў сістэме "Белпошты" (як вядома, ў тамтэйшых каталогах іх дасюль няма), а таксама ў прыватных распаўсюднікаў.

— На гэтым прыкладзе яскрава бачна, што ўяўляе сабой абвешчаная ў краіне лібералізацыя. Чыноўнікі здольныя пайсці насустрач грамадству роўна настолькі, наколькі ім будзе дадзена каманда "зверху". Пакуль жа такое рашэнне прынятае толькі наконт "Народнай Волі" і "Нашай Нівы". Але гэтага мала. Лібералізацыя павінна быць унутры самой сістэмы. Пакуль гэтага няма, — каментуе сітуацыю Алесь Зарэмбюк.

# «Адвязіце іх у вёску»

**Лукашэнка пазіцыянуе сябе як цара і тым самым падрывае асновы павагі да закону.**



У «Кнігарні «Наша Ніва» сёлета мае выйсці манаграфія прафесара Анджэя Суліми Камінскага «Рэспубліка супраць аўтакратыі: Рэч Паспалітая і Расія, 1686—1697». Аўтар вывучаў дыпламатычныя кантакты паміж краінамі ў перыяд, калі Расія ўваходзіла ў сілу, пачаўшы эксплуатацыю гіганцкіх калоній Сібіры і Уралу, а Рэч Паспалітая перажывала спад. Нават ад гэтых часоў сілы дзяржаўнага ладу краіны і адданасці яму нашых продкаў хопіць, каб РП пратрымалася яшчэ цэлае стагоддзе. Я згадаў пра гэтую кнігу, калі прачытаў аб прыгожым жэсце, зробленым Аляксандрам Лукашэнкам 6 лютага на нарадзе па ўдасканаленні крымінальнага заканадаўства.

Лукашэнка звярнуўся да міністра ўнутраных справаў Уладзіміра Навумава з загадам: «Калі ласка, заўтра вы іх адвязіце ў вёску, я вас прашу, няхай яны жывуць у вёсцы, а вы вядзіце сваю крымінальную справу, — гэта пра трох палешукоў, якія лінчавалі ашалелага катаржніка, што не даваў спакою вёсцы. — Адвязіце людзей у вёску, і няхай працуюць там, знаходзяцца ў сваіх сем'ях, а вы іх запрашайце і дапытвайце, гэта для іх будзе лепш, чым сядзець у следчым ізалятары».

У той жа дзень абвінавачваных прывезлі з СІЗА ў роднае сяло Пухавічы Жыткавіцкага раёну.

Звяртаючыся да старшыні Вярхоўнага суду Валянціна Сукалы, Лукашэнка ўказаў: «Я папрасіў бы, каб вы лаяльна вялі гэтую крымінальную справу. І вельмі вас прашу, пастаўцеся як да сваіх родных людзей. Ну нягоднік ён, людзей тэрарызаваў, цэлую вёску. Калі ўжо мужыкі на гэта пайшлі, напэўна, яны сапраўды абураныя былі, і ўсё ж простыя людзі на іх баку. Калі трэба прыняць рашэнне ў рамках заканадаўства, я гатовы прыняць, але мне падаецца, вы без мяне там прымеце рашэнне. Гэтых людзей трэба адпусціць, весці следства, няхай гэтае следства ідзе. І нават прашу публічна, не саромеючыся, суд, каб вы вельмі ўважліва паставіліся, і калі ёсць магчымасць, падтрымалі гэтых людзей. Нельга іх саджаць! Што гэта — вялікі чалавек загінуў? Па турмах туляўся, прыйшоў і яшчэ тэрарызуе цэлую вёску».

Файная папулісцкая інсцэнізацыя перад тэлекамерамі. Сарказі таксама папуліст, але немагчыма ўявіць сабе такі жэст у ягоным ажыццяўленні, ці нават у Буша, хоць той паходзіў з франціру, на якім суды лінчу колісь былі дазволеныя заканадаўствам. У дэмакратычных краінах судовая ўлада незалежная ад выканаўчай. Гэта закон.

Манарх, якога стагоддзямі прызнавалі беларусы і якому былі верныя, — кароль Рэчы Паспалітай — не мог сваёй воляй пакараць самага дэградаванага грамадзяніна. Закон не дазваляў. Грамадзянаў — імі на той час была шляхта, якая складала 10 працэнтаў насельніцтва краіны — мог пакараць толькі адпаведны суд.

Мілаваць кароль мог і карыстаўся гэтым правам — але толькі пасля рашэння суда.

З дзяржавою атаесамляліся грамадзяне, а не кароль, якога яны абіралі. «Дзяржава — гэта мы», лічылі грамадзяне, і адпаведна дзейнічалі, і дзякуючы гэтаму Рэч Паспалітая была ўтварэннем, якое пратрымалася шмат стагоддзяў сярод мацнейшых і агрэсіўных суседзяў.

Зусім інакшым быў фармат Маскоўскае дзяржавы. Тут усё ніякага «мы», акрамя «мы, цар Вялікія і Малыя і Белыя...». «Дзяржава — гэта я», больш за тое, у адрозненне, скажам, ад караля сонца Людовіка XIV, цару належала не толькі заканадаўчая і выканаўчая ўлада, а і судовая, ды яшчэ і сакральная роля.

Характэрнай рысай царскае сістэмы было тое, што менавіта цар меў манаполію на ажыццяўленне правасуддзя,

і Суліма Камінскі бліскуча апісвае, як гэта функцыянавала і што з гэтага вынікала.

Як прадэманстраваў іншы гісторык, Эдвард Кінан, расійскім чыноўнікам забаронена было згадваць неўраджаі ці эпідэміі, бо гэта магло пашкодзіць царскай рэпутацыі. («Крызісу ў нас няма».) Забаранялася прызнаваць ваенныя паразы ці памылкі адміністрацыі, бо пад началам цара не бывае памылак. У выніку Расія трапляла ў бясконцае кола хлусні (якое ў наш час называецца статыстыкай і рэйтынгамі). Суліма-Камінскі прыводзіць цытаты з данясенняў дыпламатаў Рэчы Паспалітай, якія напачатку проста шалелі ад гэтай рытуальнай маны ў вочы, мяркуючы, што з іх здзекваюцца, пакуль не прывыклі.

Самасуд на Палессі адбыўся ад таго, што сілавыя структуры самаўхіляюцца, бездзейнічаюць, працуюць неэфектыўна

— хто з нас з тым не сутыкаўся — перадусім праз дысфункцыянальнасць сістэмы, у якой апаратыўныя работнікі задыхаюцца ад перагрузкі пры адначасовай раздзьмутасці апарату палітычнага вышуку. Адбыўся таксама праз хібы ў законах, якія не дазваляюць ізаляваць тыпаў, як жыткавіцкі падпальшчык. І праз жахлівую сацыяльную дэградацыю рабскае вёскі.

Беларускі цар таксама мілуе і карае. У цара можна дабіцца справядлівасці. Цар — бацька. Калі штосьці не так, то цар проста пра гэта не ведае. Цар ніколі не памыляецца. Ён бездакорны. Вось які вобраз ствараюць Лукашэнку. Народны цар, «адзін з нас, вынесены наверх», заступнік простага чалавека («простыя людзі на іх баку»).

Архетып цара актыўна выкарыстоўвалася і выкарыстоўваецца Лукашэнкам пры рэалізацыі ягоных паліттэхналагічных схемаў.

«Вы ў нас трошкі больш чым Бог», —калісьці трапна схапіў гэта берасцейскі ваявода. Сама выбраная мянушка «Бацька» адсылае як да падняпроўскіх казацкіх атаманаў, так і да цара бацюхны, айца народу.

Як і цара, «Кіраўніка дзяржавы» не дазволена крытыкаваць нават у малым. Ва ўсіх могуць быць «недочеты» — у Адміністрацыі прэзідэнта, у міністраў, у генералаў — але не ў цара.

Ну і як жа вялікаму цару можа гаварыць на мове малое нацыі? Не па чэсці...

Прэзідэнт можа памілаваць — але толькі пасля таго, як вынес сваё рашэнне незалежны суд.

Так дзейнічае еўрапейскае правасуддзе. Пакуль будзе інакш, Беларусь будзе заставацца краінай тыранічнай.

Самадзяржаўе Лукашэнкі — ужо не проста імідж. На сёння Лукашэнка дэ факта трымае ў сваіх руках заканадаўчую, выканаўчую і судовую ўладу. Фармальна замацаваны ў Канстытуцыі падзел уладаў не рэалізуецца на практыцы.

Які ён «еўрапейскі лідэр» пры такім стаўленні да права і нацыянальнае мовы, пры адсутнасці падзелу ўладаў?

Спагада моцным хлопцам з над Прыпяці не павінна засланяць ад нас абсалютную заганнасць аўтакратычных прыёмаў з гледзішча праваной дзяржавы.

Патрэба мець у дзяржаве моцную, г.зн. эфектыўную ўладу і падмацоўваць яе палітычнай папулярнасцю не дае права правам пагарджаць.

Як палітычны інстытут, кароль Рэчы Паспалітай быў «слабейшы» за расійскага цара. Аднак звярніце ўвагу, што ніводзін кароль і ніводзін ягоны нашчадак не былі забітыя, не скончылі сваіх дзён у турме. Іх часам выганялі, пераабіралі, але не забівалі і не садзілі ў турму. У Расіі цароў труцілі, душылі, забівалі, памяшчалі ў манастыр, самі цары забівалі сваіх дзяцей — патэнцыйных змоўшчыкаў. Абсалютная цана абсалютнай улады.

Хачу звярнуць увагу, што

царская форма ўлады была ўласціва расійскай тыраніі, але не Беларусі з яе традыцыямі,

з аднаго боку, рэспубліканізму, з другога, ВКЛаўскай алігархіі.

Прышчапляць царызм нашай краіне — азначае палітычна і ментальна русіфікаваць.

**Барыс Тумар**

## Улады не хочуць непадкантрольных арганізацый

**Мастоўскі раённы выканаўчы камітэт адмовіў Алесю Зарэмбюку, каардынатару ініцыятыўнай групы па стварэнню грамадскага аб'яднання "За Еўрапейскую Мастоўшчыну", у прадстаўленні юрыдычнай адрэсы для рэгістрацыі грамадскай арганізацыі, спаслаўшыся на адсутнасць у наяўнасці свабодных для размяшчэння арганізацыі памяшканняў.**



"Такім чынам, мастоўскія ўлады паказалі, што яны не зацікаўлены ў легалізацыі грамадскай дзейнасці ў Мастоўскім раёне, а лібералізацыя грамадскага жыцця аб'яўленая кіраўніком Беларусі носіць касметычны характар і ніякім чынам не скравана на развіццё грамадзянскай супольнасці на месцах" — паведаміў Алесь Зарэмбюк.

## Вогненная статыстыка

**Паводле звестак падраздзялення Мастоўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях за 2008 год мастоўскімі выратавальнікамі было здзейснена 223 выезды, з якіх 98— на пажары, - на дэмеркурызацыю ртуці 101— на аказанне дапамогі насельніцтву (адкрыванне дзвярэй, знос аварыйных дрэў, ліквідацыя гнёздаў шэршняў і інш.) 12— на забеспячэнне бяспекі ў час правядзення раённых культурна-масавых мерапрыемстваў.**

У мінулым годзе у агні загінулі 6 жыхароў раёна, урон, нанесены пажарамі склаў 69,4 мільёна рублёў. А дзякуючы аператыўнасці падраздзяленняў РАНС і пільнасці суседзяў, было выратавана 12 чалавек і матэрыяльных каштоўнасцей на суму больш як 140 мільёнаў рублёў.

Па выніках службовай дзейнасці за 2008 год аддзел па надзвычайных сітуацыях нашага раёну заняў пятае месца сярод дзевятнаццаці аддзелаў вобласці.

**Ул.інф.**

## "Героі і гераіні беларускага кахання"

**Мультымедыйным аповедам з такой назвай актывісты Руху "За Свабоду" віншуюць гарадзенцаў з Днём Святога Валянціна.**

Чаму Гародню называлі "Вялікакняскай сталіцай кахання 18 стагоддзя"? Чаму Антоні Тызенгаўз ніколі не быў жанаты і не меў каханак? Гарадзенскія балі часоў Станіслава Аўгуста Панятоўскага, як на іх выглядалі гарадзенскія жанчыны. Жыгімонт і Барбара Радзівіл, Юзаф Сапоцька і яго залёты, Ян Караль Хадкевіч і Зоф'я, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі і Люлі. Вы зможаце даведацца падрабязнасці ўсіх гэтых гісторый.

У праграме — прэзентацыя партрэтаў ды імёнаў гарадзенскага кахання, эратычныя беларускія загадкі.

Аўтарка "Герояў і гераіняў беларускага кахання" — Наталля Сліж, кандыдат гістарычных навук, знаўца гісторыі беларускай сэкса, сям'і, шлюба і пазашлюбных адносін у гісторыі Беларусі.

Пачатак імпрэзы: пятніца, 13 лютага, 18.30, Гродна, Будзёнага 48а-44 (памяшканне Таварыства Беларускай Школы). Дзеці да 16 гадоў запрашаюцца з бацькамі. Уваход вольны.

**Прэс-служба Гарадзенскага Руху "За Свабоду"**

# Гендырэктарка “Белпошты” адмовіла чытачу дэмпрэсы

**“Белпошта” працягвае дыскрымінаваць недзяржаўныя газэты, па камандзе зверху вярнуўшы магчымасць трапляць да чытачоў толькі “Народнай Волі” і “Нашай Ніве”.**

Дэмакратычны актывіст з Гродзеншчыны Алесь Зарэмбюк напісаў у сталіцу наступны ліст паштоваму начальству:

“Я, жыхар горада Масты, чытач выданняў “Газета Слонімская” і “Новы Час”, хачу атрымаць ад Вас адказ на наступнае пытанне: на якой падставе выданні “Газета Слонімская” і “Новы Час” не ўключаны ў падпісныя каталогі на 2009 год?.. Патрабую не ствараць штучных перашкодаў для доступу чытачоў да згаданых выданняў і ўнесці ў бліжэйшы месяц гэтыя СМІ ў падпісны каталог”.

Адказ ад гендырэктаркі “Белпошты” Аляксандры Чарняк мог бы, здаецца, расчуліць самага сярдзітага чалавека. Спадарыня Чарняк найветліва пачала ліст спадару Зарэмбюку: “Паважаны Аляксандр Віктаравіч!”, і гэтаксама ветліва закончыла: “З павагаю...”




Як тут будзеш крыўдаваць, тым больш усё па-беларуску напісана! Паштовая начальніца пры гэтым падрабязна растлумачыла незадаволенаму чытачу, што “продаж, падпіска, дастаўка, раздача перыядычных друкаваных выданняў” адбываецца строга ў адпаведнасці з Законам аб друку. Пры гэтым чыноўніца важка зазначыла: “Прымусовае заключэнне дагавароў не дапушчаецца”! (Пункт 1 артыкула 391 Грамадзянскага кодэксу РБ). І яшчэ больш фундаментальна абгрунтавала: “Ніхто не можа быць прымушаны выконваць абавязкі, якія не прадугледжаны Канстытуцыяй РБ і яе законамі, або —адмовіца ад сваіх правоў” (артыкул 58 Канстытуцыі).

Вы думаеце, спадарыня Чарняк на гэтым скончыла? Не! Яна паведаміла чытачу з Мастоў, што “РУП “Белпошта”, з'яўляючыся суб'ектам гаспадарання, мае права ў сваёй камерцыйнай дзейнасці кіравацца эканамічнай мэтазгоднасцю. Паколькі заканадаўства не абавязвае ўключаць друкаваныя выданні ў каталог, выбар друкаваных выданняў з мэтаю распаўсюджвання праз падпіску з'яўляецца правам РУП “Белпошта”, якое рэалізуецца ім у адпаведнасці з законам”.

Паўстае рытарычнае, зрэшты, пытанне: чаму, напрыклад, “Белпошта” гэтак любіць газету “Слонімскі веснік” і зусім не любіць “Газету Слонімскую”? Таму што першая зьяўляецца друкаваным органам мясцовай улады, а другую вельмі любіць не начальства, а чытачы? Раз так, “Газету Слонімскую” даўно забаронена друкаваць не толькі мясцовай друкарні, але таксама ўсім іншым дзяржаўным на тэрыторыі РБ. А паколькі пошта таксама ў нас выключна дзяржаўная, то і яна строга выконвае загад зверху.

Усё беларускае насельніцтва, у тым ліку і начальніца “Белпошты”, выдатна ведае: з кожнага паштовага аддзялення рэгулярна выціскаюць сокі, гвалтам прымушаючы даваць план па падпісцы на “цэнтральныя”, абласныя, раённыя і гэтак далей — афіцыйныя рупары. І паспрабуй не выканай!

Цікава, спадарыня Чарняк таксама лічыць гэта “канстытуцыйным правам у сваёй камерцыйнай дзейнасці кіравацца эканамічнай мэтазгоднасцю”?

**Алесь Кавалёў, Масты**

## Рэкордная інфляцыя

**У Беларусі ў студзені 2009 г. спажывецкія цэны выраслі на 4,1% пасля росту на 1,2% за снежань 2008 году, паведамляе Белстат.**

Гэты ўзровень студзеньскай інфляцыі з'яўляецца абсалютным рэкордам са студзеня 2003 г., калі спажывецкія кошты выраслі на 4,3% за месяц. Мінэканомікі чакала інфляцыю ў студзені ў межах 3,5%.

Зацверджаны прагноз на 2009 год прадугледжвае абмежаванне росту спажывецкіх цэнаў у межах 9-11%.

Між тым, Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЭБРР) прагназуе значнае падзенне тэмпаў росту ВУП Беларусі ў 2009 годзе і рост інфляцыі ў раёне 15%.

**Радыё Свабода**

## Сумная статыстыка Гарадзеншчыны

**Сумную статыстыку транспартных аварый мінулага году на дарогах Гарадзеншчыны папоўнілі трагічныя выпадкі студзеня. За гэты час у Прынёманні адбылося 40 аварый, у якіх загінула 15 чалавек.**

Як паведаміў намеснік начальніка абласной ДАІ УУС гарадзенскага аблвыканкаму Анатоль Клімаў, летась у кожнай пятай аварыі кіроўцы знаходзіліся ў нецвярозым стане, а ў кожным чацвёртым выпадку гінулі людзі. За 2008 год адбылося больш за 800 аварый, супрацоўнікі ДАІ затрымалі звыш 7 тысяч п'яных кіроўцаў, а ў аварыях загінула 194 чалавекі. Аднак, па словах Анатоля Клімава, часам і пешаходы не дбаюць пра сваю бяспеку і паводзяць сябе на дарогах надта самаўпэўнена. А гэта пры не найлепшых умовах надвор'я павышае аварыйную абстаноўку ў рэгіёне.

**Радыё Рацыя**

# Скарачаць сабе заробак беларускія чыноўнікі не спяшаюцца

**Як даведалася Еўрарадыё, ініцыятыва латвійскага кабінета міністраў пакуль не знайшла падтрымкі ў беларускіх калідорах улады**

Днямі кіраўнік латвійскага ўрада Івар Годманіс сам напісаў заяву з просьбай знізіць яму заробак на 15 адсоткаў. Такую ж заяву пачалі падпісваць і міністры яго кабінета. Палітычная аглядальніца штодзённай латвійскай газеты “Тэлеграф” Аляксандра Глухіх у інтэрв'ю Еўрарадыё выказала меркаванне, што такі ўчынак выкліканы, хутчэй за ўсё, набліжэннем выбараў.

Аляксандра Глухіх: “Ну, вядома, гэта ў нейкай меры папулісцкі крок, дзесьці яны хацелі “быць бліжэй да народа”, таму патрабавалі, каб ім, так жа, як і ўсім простым падаткаплацельшчыкам, былі зніжаны заробкі. Тут нельга забываць, што ў нас набліжаюцца выбары ў Еўрапарламент. Таму ўсе палітыкі памятаюць пра тое, што пра іх думаюць падаткаплацельшчыкі, і, адпаведна, іх жа выбарнікі”.

Праўда, аглядальніца “Тэлеграфу” не выключае і таго, што ў рашэнні прэм'ера і яго міністраў адыграла пэўную ролю і вельмі напружаная эканамічная сітуацыя ў краіне. Такім крокам яны спрабуюць крыху “збіць” узровень напружанасці ў грамадстве. Дарэчы, з-за фінансавага крызісу ў Латвіі ўсе дзяржаўныя службоўцы пачалі атрымліваць скарочаныя заробкі.

Беларусь таксама закрануў фінансавы крызіс. Але, як паведаміў Еўрарадыё прэс-сакратар прэм'ерміністра Беларусі Сяргея Сідорскага Аляксандр Цімашэнка, паўтараць учынак свайго латвійскага калегі наш прэм'ер не збіраецца. Прынамсі, кажа, ён нічога пра такія планы свайго шэфа не ведае.

Кіраўнік прэс-службы Міністэрства прамысловасці Аляксандр Балышаў найперш перапытаў у Еўрарадыё, што на гэты конт сказаў прэс-сакратар беларускага прэм'ера. А потым прызнаўся, што міністр прамысловасці Анатоль Русецкі, а следам і іншыя чыноўнікі гэтай установы, паступяць са сваім заробкам так, як загадаюць зверху.

Аляксандр Балышаў: “Мы ў іх падпарадкаванні знаходзімся. Таму, што ён сказаў - тое ў роўнай ступені можа распаўсюджвацца і на ўсе міністэрствы”.

Намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур прызнаўся, што нічога пра ініцыятывы латвійскага прэм'ера не чуў. Таму нічога на гэты конт ні адносна міністра Мікалая Зайчанкі і яго заробку, ні адносна сябе сказаць не можа.

Андрэй Тур: “Першы раз чую пра гэтыя справы латвійскія. Таму нічога не магу сказаць. І мне цяжка сказаць, як я магу ставіцца да той ініцыятывы, якой я не ведаю. Вы мне зараз агучылі, я гэта чую першы раз, а вы хочаце, каб я адразу нешта ўзяў, ды на гэты конт адказаў. Падумайце самі: у вас нейкая інфармацыя з'явілася і вы бух — на мяне вывальваеце. Што я магу сказаць? Ды нічога! Ды і на гэты конт што можна казаць?!”.

А намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці Палаты прадстаўнікоў Аляксандр Шаўко хоць і прызнаўся, што нічога не ведае пра ініцыятыву латвійскіх чыноўнікаў, адразу пачаў разважаць, ці дапаможа гэты крок справіцца з эканамічным крызісам краіны.

Аляксандр Шаўко: “Каб на гэтае пытанне адказаць, трэба паглядзець: што гэта дасць? Ёсць пэўная інфармацыя аб развіцці эканамічнага крызісу, і я ведаю, што сітуацыя, якая сёння раскручваецца ў Прыбалтыцы, на Ўкраіне, вельмі складаная. Таму яны і прымаюць крайнія меры. У тым ліку і гэтая ініцыятыва ўрада. Я лічу, што ў Беларусі мы яшчэ да гэтага не падышлі, і ставіць так пытанне адносна нас, напэўна, некарэктна”.

У выніку прыйшоў да высновы, што прымаць ці не такія “крайнія меры”, на якія рашыліся прэм'ер і міністры ў Латвіі, іх беларускія калегі могуць толькі паводле вынікаў працы беларускай эканомікі ў першым квартале бягучага года.

Аляксандр Шаўко: “Гэтае пытанне можна будзе пачаць абмяркоўваць тады, калі ўжо будзе бачна — якая сітуацыя раскручваецца ў эканоміцы. Сёння ў нас сітуацыя больш-менш кіруемая. Мяркую, паводле вынікаў першага квартала нешта можна будзе казаць. Сёння гэта рабіць цяжка”.

**Воля Гналько, Зміцер Панямонаў, Еўрарадыё**

# Права і праваапрымяненьне

**"Выбары ня толькі Закон, але і ПАЛІТЫКА.**
**Ад ПАЛІТЫКІ ЎСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ."**
**З выступу Старшні ЦВК Л. Ярмошынай**

На БТ 10.07.2008 г.

Пасля выбараў у беларускі парламент "Палатку" прайшло даволі часу і, каб не выказваньні ўладаў, то выбараў быццам бы і не было. На жаль, апазіцыя па апрацаванаму сцэнару ніякага аналізу сваёй працы не праваодзіць. Не дай Бог кагосьці пакрытыкуюць. Лепш традыцыйна аб'явіць аб сваёй адабранай "перамозе" і канцы ў воду да наступнай "бітвы" за Беларусь. Таму размова не аб апазіцыі, бо гэта "карова сьвятая". І можна было б пагадзіцца з правіламі гульні, але не сыціхае ўлада. І вось каторы раз на БТ 29 сьнежня з вуст Лукашэнкі прагучала, што галоўнае для нас тое, што выбары прайшлі ў адпаведнасьці з нашымі Законамі, з чым пагадзіліся назіральнікі як з СНД, так і з АБСЕ. Баюн хоча ўбаюкаць. Ці сапраўды так? Актуальным гэта пытаньне яшчэ з'яўляецца таму, што ўпарта ходзяць чуткі, што, неўзабаве, распачнецца праца па зьмяненьню Выбарчага Кодэксу, на чым настойваюць як дэмакраты так і Эўразвяз. Нават вядуцца кансультацыі аб змене выбарчага заканадаўства з прадстаўнікамі БДІПЧ АБСЕ. Але ня трэба забываць, што ёсьць права і ёсьць праваапрымяненьне. І пры існуючым Законе можна правесьці дэмакратычныя выбары пры ўмове строгага і поўнага яго выкананьня ўсімі ўдзельнікамі. А на справе?

Ужо дзесяткі, а можа сотні, разоў на розных семінарах і ў розных інструкцыях разледжана, дзе і як улады могуць фальсіфікаваць выбары. Але няма інструкцыі як не дапусьціць паўсюднае парушэньне Выбарчага Кодэксу. Таму пры распрацоўцы зменаў, нават калі б такое стала мажлівым, трэба быць максімальна прадбачлівымі і акуратнымі. Нават, калі ў Закон аб выбарах будзе запісана патрабаваньне аб абавязковым увядзеньні ў склад камісій прадстаўнікоў палітычных партый, то тут жа з'явяцца патрэбныя і лаяльныя дзеючай уладзе партыі кшталту Белая Русь, ЛДПБ ці Аграрная...

Разледзім на некалькіх прыкладах, каб ня быць галаслоўнымі, як на канкрэтным Луненскіскім выбарчым участку №58 Мастоўскай выбарчай акругі №56 "выконвалася" выбарчае заканадаўства. Толькі некалькіх, бо каб апісаць усё , трэба вельмі шмат рэдакцыйнай плошчы. Адразу адзначу, што, калі для нас-грамадзянаў Беларусі, механізм фальсіфікацый і парушэньняў існуючага Выбарчага Кодэксу ясны і празрысты, то замежныя назіральнікі ( СНД ня лічыцца, тыя ўсё разумеюць) абсалютна "не ўрубаюцца". Гэта па-за межамі іх сьвядомасьці, як у анекдоце пра рускіх, якія на задняй хуткасьці ехалі па нямецкаму аўтабану.

Згодна з арт. 67 Выбарчага Кодэкса выбарчымі камісіямі павінна быць праверана "не менее 20% подписей" выбаршчыкаў якія падпісаліся за вылучэнне грамадзяніна кандыдатам у дэпутаты. Так у рамках дзеючага выбарчага заканадаўства, ў апазіцыйнага кандыдата правяраюць 100% подпісаў, каб "накапаць" патрэбныя 15% несапраўдных, а подпісы патрэбнага кадыдата не правяраюць зусім і затым канстатуюць 100%-ую правільнасьць, што практычна нерэальна. Гэта і зразумела, бо практычна для праўладнага кандыдата подпісы збіраюць прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі (што забаронена Законам), дабравольна прымушаныя настаўнікі, медработнікі і інш. якія як і ўсе нармальныя людзі не могуць не памыляцца. На праверку подпісаў назіральнікаў не дапускаюць, азнаёміцца з "недостоверными" подпісамі не даюць. Таму абскардзіць такую " праверку" практычна немагчыма. Трэба каб у Законе было прапісана абавязковасьць прысутнасьці на праверцы подпісаў падстаўнікоў ініцыятыўных груп прэтэндэнтаў у кандыдаты ў дэпутаты і выдача копій падпісных лістоў з несапрўднымі подпісамі выніковых пратаколаў акруговай выбарчай камісіі.

Немагчыма растлумачыць Эўрапейцам факты прымусовага датэрміновага галасаваньня. Свабодны чалавек які жыве ў дэмакратычным грамадстве ня можа зразумець чалавека, які жыве ў аўтарытарнай краіне з так званым "прыгонным правам"! Начальнік на прадпрыемстве адкрытым тэкстам загадвае сваім падначаленым прагаласаваць датэрмінова, пагражаючы ў выпадку невыкананьня загаду, звальненьнем з працы. Спробы абскардзіць ці абнародаваць такія факты аўтаматычна вядуць да звальненьня з працы і ніякі суд не дапаможа аднавіць справядлівасьць.

У справе датэрміновага датэрміновага галасаваньня парушэньні Выбарчага Кодэкса ўведзена ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Назіральнікам Луненскага выбарчага ўчастка №58 у ЦВК была накіравана заява наступнага зместу:

"У адпаведнасьці з арт. 53ч.1 Выбарчага Кодэксу Рэспублікі Беларусь "Выбаршчык, удзельнік рэферэндуму, НЕ МАЮЧЫ МАГЧЫМАСЬЦІ ў дзень выбараў, рэферэндуму ЗНАХОДЗІЦЦА ПА МЕСЦУ СВАЙГО ЖЫХАРСТВА, мае права..." і г.д. па тэксту.

Мною было выяўлена, што на працягу ўсяго тэрміну датэрміновага галасаваньня з 23.09 па 27.09 2008г. па "беларускаму" радыё і тэлебачаньню вялася агітацыя за датырміновае галасаваньне і СКАЖАЎСЯ Выбарчы Кодэкс Рэспублікі Беларусь. Дыктарскі тэкст гучаў так:"Калі хто ня мае магчымасьці прагаласаваць 28 верасня, то МАЕ ПРАВА ПРАГАЛАСАВАЦЬ ДАТЭРМІНОВА"- што не адпавядае арт.53 ч.1 Выбарчага Кодэкса Рэспублікі Беларусь. Чым уводзіліся ў зман выбаршчыкі. Нават увялі ў зман сакратара ЦВК Лазавіка, які прагаласаваў датэрмінова. Калі спадар Лазавік ня ведае Выбарчага Кодэксу, то ён ня можа быць у складзе ЦВК. Калі ж ён ведае і ,парушаючы заканадаўства, зводзіць у зман выбаршчыкаў, то таксама ня можа быць у складзе ЦВК.

У сувязі з вышэй выкладзеным прапаную:

1.Выключыць спадара Лазавіка са складу ЦВК у сувязі з неадпаеднасьцю.

2.Бюлетэні датэрміновага галасаваньня лічыць несапрўднымі, так як датэрміновае галасаваньне было праведзена з грубымі парушэньнямі Выбарчага Кодэксу (арт.53 ч.1)".

У парушэньне заканадаўства на гэту заяву адказу не было.

Вось як развіваліся падзеі на Луненскім выбарчым участку па выкананьню Закону па захаваньні скрыні з бюлетэнямі датэрміновага галасаваньня.

Старшыня участковай камісіі В. Чэрнік у присутнасьці назіральнікаў адляпіў паперку, прычэпленую на дзірку на скыньці для датэрміновага галасаваньня для ўкідваньня бюлетэняў, нікольки яе не пашкодзіўшы. Так, што яе паўторна можна было прылпіць на тое ж месца. Скрынку клаў на захаваньне у сэйф бухгалтара сельскага савета і апячатваў пласьцялінам і сваёй пячаткай. У любы час ён мог вярнўцца да гэтага схрону адзін і замяніць ці дабавіць бюлетэні, зноў прывёўшы "схрон" у першапачатковы стан.

Назіральнікам быў складзены Пратакол і Акт аб парушэньні арт. 53 ч. 4 і дасланы 24 .09. старшыні выбарчага ўчастка №58, пракурору Мастоўскга раёна, у акруговую выбарчую камісію №56. У выніку з пракуратуры адказ не прыйшоў, з акруговай камісіі адказ прыйшоў пасьля выбараў з такім тэкстам: "факт остаётся без рассмотрения... в связи с тем, что он поступил в окружную избирательную комиссию после проведения выборов..., а именно 30 сентября 2008 года".(60 км ліст ішоў 6 дзён?) Ад старшыні участковай камісіі адказ прыйшоў на другі дзень, 25.09, у якім казалася, што чорнае гэта белае: "...хранение производится в строгом соответствии с требованиями ст.53 Избирательного кодекса и Методических рекомендаций...". Як кажуць, прыехалі. Можа сабака закапана ў гэтых "Методических рекомендациях"?

У выніку такой перапіскі і заўваг, якія назіральнік пісаў у сшытак для заўваг, ужо ў вуснай грубай форме Старшыня выбарчага ўчастка В. Чэрнік заявіў назіральніку, што ніякай інфармацыі аб выбарах даваць яму ня будзе, а, калі ён будзе працягваць пісаць заўвагі, то не дапусьціць яго(назіральніка) да назіраньня. На гэту пагрозу назіральнік склаў таксама заяву і 26.09 адаслаў яе па тым самым адрасам і яшчэ ў ЦВК. Па тэлефоне былі праінфармаваны назіральнікі з АБСЕ, якія праз 2 гадзіны прыехалі на ўчастак.

З акруговай камісіі адказ прыйшоў пасьля выбараў слова ў слова як першы, копію адказу з ЦВК варта паказаць (гл. здымак), другіх адказаў не было.

Адзначым такую "дробязь": усе заявы пісаліся на беларускай мове, усе адказы, што прыйшлі, на расейскай мове.

Узнікае пытаньне, чаму такім важным для ўладаў з'яўляецца датэрміновае галасаваньне, што яны аткрыта ў дзяржаўным маштабе ідуць на парушэньне існуючага Закона? Дзякуючы датэрміноваму галасаваньню ўлада вырашае два ключавых пытаньні. Па-першае: забяспечваецца факт, што выбары адбыліся( датэрмінова на Луненскім участку прагаласавала 22% выбаршчыкаў або 28% ад ліку прыняўшых удзел у галасаваньні), па-другое: ствараецца магчымасьць лёгкай бескантрольнай фальсіфікацыі пры такой неабходнасьці.

Для вырашэньня гэтых самых задач служыць галасаваньне па месцы жыхарства. Таму і тут улады ідуць на прамое і адкрытае парушэньне Выбарчага Кодэкса.Як звычай, ніякіх заяў ад выбаршчыкаў аб галасаваньні па месцы жыхарства , за рэдкім выключэньнем, не паступае. Пачакаўшы да гадзін 12 у дзень галасаваньня, сакратаром камтісіі робіцца выбарка са спісаў выбаршчыкаў, хто яшчэ не прагаласаваў. Даюцца бюлетэні членам камісіі і тыя адлаўліваюць людзей , у лепшым выпадку, дзе змогуць: на вуліцы, на працы, у гасьцях і г.д. Пра пашпарты, якія павінны прад'яўляцца пры атрыманьні бюлетэня для галасаваньня, ніякай мовы нават не ідзе . У горшым выпадку, члены камісіі нікога не ловяць, а самі ўкідваюць бюлетэні ў скрынку. Часьцей за ўсё спалучаюцца гэтыя абодва "метады".

Па афіцыйным дадзеным на Луненскім участку па месцы жыхарства прагаласавала тых жа 28% альбо 217 выбаршчыкаў. Фактычна-больш за 300.

Нават згодна з афіцыйнымі дадзенымі, пры атсутнасьці датэрміновага галасаваньня і галасаваньня па месцы жыхарства, выбары на Луненскім выбарчым участку №58 не адбыліся б у ніякім разе.

Пра парушэньні Закона пры фармаваньні выбарчых камісій нават сорамна пісаць. Можа ўспомнім толькі пра адну акалічнасьць. У складзе выбачай камісіі на Луненскім участку былі: дырэктар школы-старшыня і два настаўнікі з гэтай школы, Сакратар сельсавета-сакратар і тры работніка сельсавета, тры работніка калгаса...

Праводзімыя ў часы кіраваньня Лукашэнкі "выбары" не адпавядаюць ня толькі крытэрыям Эўразвязу, але цалкам не адпавядаюць існуючаму на Беларусі Выбарчыму Кодэксу. Таму, перш чым мяняць Выбарчы Кодэкс, трэба выпрацаваць механізмы яго строгага выкананьня. Без гэтых механізмаў ніякія змены выбарчага права плёну не дадуць.

**Лявон Карповіч,**
**Луна, 2009г.**

**PS.** У выніку дрэннай якасьці копіі адказу з ЦВК надрукуем яго на мове арыгінала:

"Ваше обращение рассмотрено 3 октября тюгю на заседании Центральной комиссии.

Сообщаем, что права наблюдателя определены в части четвёртой статьи 13 Избирательного кодекса Республики Беларусь. Данной нормой не предусмотрено право наблюдателя получать сведения о числе избирателей, проголосовавших досрочно. Эта информация не является секретной и Центральная комиссия рекомендовала участковым избирательным комиссиям предоставлять подобные сведения наблюдателям. К сожалению, Ваше обращение свидетельствует о том, что не все члены комиссий последовали этому совету. Однако правовых оснований для принятия мер реагирования по данному факту не имеется.

В заключение отметим, что Ваша оценка действий председателя участковой избирательной комиссии участка для голосования №58 Мостовского избирательного округа №56 является необоснованной, поскольку в подтверждение допущенных им нарушений Вы не приводите никаких доказательств.

**Председатель комиссии**
**Л.М.Ермошина**

**PPS.** На днях ужо старшыня Кастытуцыйнага Суда заявіў, што галоўнай падзеяй 2008г. былі выбары ў палатку і што яны прайшлі ў адпаведнасьці з Законам.

**МАСТОЎСКАЯ ПРАЎДА**
Грамадска-інфармацыйнае выданне Мастоўшчыны
№ 1-2 (72-73) студзень-люты 2009 г.
**Заснавальнік: Аляксандр ЗАРЭМБЮК.**
***Дэпутат Мастоускага райсавета 24 - га склікання***
Надрукавана на фінасавыя ахвяраванні жыхароў г. Масты ў друкарні ААТ Бліц-Прынт, г. Кіеў вул. Даўжэнка, 9.
Выходзіць 1 раз у месяц.
**Распаўсюджваецца бясплатна.**
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць інфармацыі. Іх меркаванне можа не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладвае на яе ніякіх абавязкаў.